# СОЖА

вёскі. Яго імем названы вуліцы ў Слаўгарадзе, Мінску і Саратаве. Яно ўключана ў кнігу «Памяць» Слаўгарадскага раёна. У экспазіцыі Слаўгарадскага гісторыка-краязнаўчага музея подзвігу Панамарова прысвечана дырама, дзе 19-гадовы даводчык вядзе абстрэл пры дапамозе свайё саракапяткі. Батальёнам, у складзе якога ён знаходзіўся, былі адбіты шэсць атак. Загінулі ўсе, Панамароў адбіваўся да апошняга. Пасмяротна яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

## ВЫЗВАЛЕННЕ РАЁНА Ў ЭКСПАНАТАХ

Тэме вызвалення ў раённым гісторыка-краязнаўчым музеі прысвечана некалькі цікавых экспанатаў.

**Навуковы супрацоўнік музея Андрэй КАВАЛЁЎ** дэманструе адзін з іх — кулямёт «Максім».

— Такім рарытэтам можа пахваліцца не кожны музей, — кажа Андрэй. — Ён перажыў рэвалюцыю, Грамадзянскую вайну і быў задзейнічаны ў ходзе Вялікай Айчыннай. Кулямёт знойдзены на тэрыторыі слаўгарадскага прафліцэя № 3 гадоў 15 таму і аднаўлены яго выхаванцамі пад кіраўніцтвам Аляксандра Халеева.



У ім усё роднае, акрамя колаў, якія зрабілі навучэнцы. Ну і, канешне, гэта ўжо не баявая адзінка. А вось кулямётная стужка з брызенту сапраўдная. Яна была пустая і ляжала ў каробцы. Гэты экспанат доўгі час знаходзіўся ў нашых фондах, але цяпер выстаўлены для ўсеагульнага агляду. На падобным свой подзвіг здзейсніў Вячаслаў Чамадураў, практычна ў адзіночку адбіўшы 19 атак. Герой быў тройчы паранены, гэтыя раненні скарацілі яму жыццё. Памёр ён у 1957 годзе, калі яму споўнілася ўсяго 38 гадоў. Пасля вайны паспеў перакваліфікавацца з кулямётчыка ў танкісты і скончыць ваеннае вучылішча. Пахаваны ў Луганскай вобласці.

У музеі захоўваецца некалькі карцін, якія ілюструюць дзеянні партызан падчас вызвалення Прапойскага раёна. Адна з іх з жыхаром, які хаваецца за дрэвам. Ён назірае за групай ваенных у савецкай форме. Мужчына пачуў, што яны размаўлялі на нямецкай мове, і своечасова паведаміў пра дыверсантаў.

— Такі эпізод сапраўды быў у гісторыі, якая адбылася ў 1943 годзе пад Прапойскам, — кажа суразмоўнік.

На другой карціне, якая таксама адсылае нас у 1943-і, пераапранутыя пад жанчын партызаны прыкрываюць статак кароў, які гоняць у лес. Андрэй Кавалёў расказвае, што гісторыя пра тое, як паліцаі забралі кароў, а партызаны іх адбілі, таксама рэальная.

А вось на карціне Васіля Камарова страшны эпізод расстрэлу мірных грамадзян, якія адмовіліся атрымліваць пашпарты з рук акупантаў. На карціне паказана, як жыхароў па чарзе выклікаюць да стала, на якім ляжаць дакументы, і ставяць перад выбарам. Тых, хто адмаўляецца, расстрэльваюць на месцы.

## РЭХА ВАЙНЫ

Пошукавае братэрства стварае цуды, ёсць прыклады, калі яно прыводзіць краіны да пабрацімства на ўзроўні раёнаў. З 2009 года яно паклала пачатак адносінам паміж Слаўгарадам і Арзамасам. Дэлегацыя гэтай вобласці прыняла ўдзел у святкаваннях.

— У Слаўгарадскім раёне плячо ў плячо змагаліся байцы 137-й стралковай дывізіі, якая ў 1944 годзе атрымала статус Бабруйскай, — кажа **намеснік кіраўніка адміністрацыі гарадской акругі горада Арзамаса Ніжагародскай вобласці Раман ШАРШАКОЎ.** — 25 чэрвеня 1941 года дывізія, якая з'яўлялася ўзорнай у Маскоўскай акрузе, была па загадзе пагружана ў эшалоны і адпраўлена на абарону Беларусі. Байцы павінны былі прыпыніць наступленне танкавых часцей Гударыяна. На жаль, з-за розных неспрыяльных абставін, якія склаліся ў першыя дні вайны, дывізія высаджвалася разрознена, штаб спрабаваў сабраць падраздзяленні. У выніку ў першыя баі яны ўступілі паасобку. З Горкаўскай (на той момант) вобласці выязджала 14 тысяч чалавек, а 30 кастрычніка 1941 года, калі дывізія выйшла ў раён горада Шчыгры, яна налічвала толькі 860 штыкоў. Лічы, уся палягла на беларускай зямлі. Дывізія дафармавалася двойчы, удзельнічала ў вызваленні Беларусі, з баямі дайшла да Германіі. Кожны раз на 9 Мая ў Арзамасе мы фарміруем вялікую калону, дзе ідуць тысячы арзамасцаў. Яе ўзначальвае сучасная бранятэхніка, якая вырабляецца ў нас. І на першым бронетранспарцёры размешчаны сцяг 624-га стралковага палка, які фарміраваўся з ліку арзамасцаў і ўваходзіў у склад 137-й стралковай дывізіі. Яны дагэтуль з намі ў калоне бессмяротнага палка.



## АД ХОЦІМСКА ДА БАБРУЙСКА

Тэме вызвалення Слаўгарада прысвечаны цэлы раздзел кнігі вядомага магілёўскага пошукавіка, **пісьменніка, кіраўніка Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалая БАРЫСЕНКІ** «Вызваленне: ад Хоцімска да Магілёва і Бабруйска», дзе ў храналагічным парадку ён расказвае, як з верасня 1943 года да чэрвеня 1944-га Чырвоная Армія ачышчала ад нямецка-фашысцкіх акупантаў гарады і раёны Магілёўскай вобласці. У раздзеле «Гомельска-Рэчыцкая аперацыя» ён падрабязна апісвае, наколькі цяжкімі былі баі і наколькі моцнымі — варожыя ўмацаванні.

«Кожная пядзя зямлі па правым беразе Проні на ўчастку Петухоўка — Слаўгарад (Прапойск) шчодра палітая крывёю салдат 50-й арміі генерала Івана Болдзіна, — піша Мікалай Барысенка. — Шматлікія тысячы з іх загінулі, большасць да сённяшняга дня лічацца прапаўшымі без вестак, а лёс людзей, якія аддалі жыцці за Айчыну, застаецца невядомы. У зводках Саўінфармбюро гэтыя падзеі гучалі прыкладна так: «...На асобных участках Гомельскага, Магілёўскага і Віцебскага напрамкаў нашы войскі вялі баі мясцовага значэння, у ходзе якіх палепшылі свае пазіцыі».

Штурм магутнага Прапойскага ўмацавання генерал Болдзін даручыў 110-й стралковай дывізіі палкоўніка Сяргея Арцем'ева. Яна дыслацыравалася за Проняй у раёне вёсак Рабавічы, Красная Слабада. Адначасова з атакай уздоўж дарогі Магілёў — Прапойск яны рыхтаваліся перарэзаць дарогі на Быхаў і Доўск.

«На досвітку 24 лістапада ранішнюю цішыню парушыў грукат разрываў тысячы мін і снарадаў, — піша ваенны пісьменнік. — Разам з артпадрыхтоўкай у атаку пайшлі і стралковыя палкі дывізіі. Нягледзячы на ўпартыя контратакі ворага на працягу дня 1287-ы, 1289-ы і 1291-ы палкі дывізіі прадухілілі супраціўленне немцаў і да вечара адрэзалі ім шляхі адступлення... Усю ноч байцы 110-й стралковай дывізіі ачышчалі горад ад ворага і тушылі пажары. 25 лістапада Прапойск быў цалкам вызвалены ад ворага...»

У вызваленні Прапойска ўдзел прымалі таксама 186-я, 413-я, 269-я стралковыя дывізіі.

## МОЦНЫЯ КАРАНЯМІ

Да юбілейнай даты ў раёне было прымеркавана ўрачыстае прыняцце школьнікаў у рады піянерскай арганізацыі і БРСМ, а дарослых жыхароў раёна — у рады грамадскай арганізацыі «Патрыёты Беларусі» і партыі «Белая Русь». Гэтыя падзеі адбыліся ў сценах Слаўгарадскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея з удзелам кіраўніцтва раёна, дэлегацый з расійскіх абласцей, грамадскіх аб'яднанняў, ветэранаў працы, дэпутатаў. Як адзначыла **дырэктар музея Святлана МЕЛЬЯНЦОВА,** такія мерапрыемствы сталі часткай дзейнасці музея. Як працяг вялікай гісторыі, якая адлюстраваная ў тутэйшых экспазіцыях.

— Мы жывём сённяшнім днём, але мінулае нельга забываць, — адзначыла падчас свайго выступлення ў музеі **старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Я — слаўгарадчанка, выхаваная на расповедах сваіх продкаў, якія сведчылі, як тут жахліва было падчас вайны. Расказвалі, што прыходзілася жыць у зямлянках, хавацца ў лясах. З першых вуснаў чула пра тое, як у горадзе фашысты зрабілі шыбеніцу і каралі камуністаў і іншых жыхароў. Яшчэ жывы наш ветэран Пётр Старавойтаў, які быў партызанскім сувязным, які асабіста бачыў, як лютавалі немцы. Дзень вызвалення быў вельмі доўгачаканы. Мы выжылі тады, выжылі і пасля Чарнобыля, засталіся тут і ствараем прадпрыемствы. У нас растуць цудоўныя дзеці, ёсць пераемнасць пакаленняў. У 2015 годзе на фестывалі «Гаспадарчы сыр» Прэзідэнт Беларусі паабяцаў жыхарам зрабіць стацыянарны мост праз Сож замест пантонната. І гэты мост сёння працуе на нашу эканоміку. Ён не толькі злучыў два берагі, але і скараціў шлях да жамчужыны нашага раёна — Блакітнай крыніцы і да сяброўскай Расіі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*г. Слаўгарад.*

